В.Ю. Бароўка

# Сучасны стан і перспектывы літаратуразнаўства

20–24 чэрвеня ў Кіеве прайшла XIV Міжнародная канферэнцыя «Мова і культура» імя прафесара Сяргея Бурагі, арганізатарамі якой выступілі Інстытут філалогіі Кіеўскага нацыянальнага універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, Інстытут мовазнаўства імя А.А. Патабні НАН Украіны, Інстытут псіхалогіі імя Г.С. Касцюка АПН Украіны, Інстытут вышэйшай адукацыі АПН Украіны, выдавецкі дом Дзмітрыя Бурагі. Канферэнцыя была надзвычай прадстаўнічая, у яе рабоце прынялі ўдзел 805 навукоўцаў з 22 краін свету. Большасць яе ўдзельнікаў складалі гаспадары – навукоўцы з Украіны; вучоныя з Рэспублікі Беларусь таксама прынялі актыўны ўдзел у рабоце аўтарытэтнага навуковага форума.

У час канферэнцыі працавала дзесяць секцый. Арганізатары паклапаціліся пра тое, каб навуковыя кантакты аказаліся максімальна выніковымі. Пачалася канферэнцыя з пленарнага пасяджэння, дзе выступілі вядомыя навукоўцы. Цікавымі былі даклады акадэмікаў Д. Затонскага пра гісторыю канферэнцый пад назвай «Мова і культура» і І. Дзюбы пра прыроду як сатворцу чалавечай этыкі. Праца кожнай секцыі 21 чэрвеня пачыналася з пленарнага секцыйнага пасяджэння, дзе вучоныя мелі магчымасць пазнаёміцца з вядучымі тэндэнцыямі ў сучасных гуманітарных навуках. Пасля секцыйных пасяджэнняў навукоўцы мелі магчымасць прыняць удзел у рабоце «круглых сталоў». Так, 22 чэрвеня «круглы стол» быў прысвечаны пытанням вывучэння гісторыі рускамоўнай паэзіі Украіны, 23 чэрвеня – адзін «круглы стол», прысвечаны гісторыка-тэарэтычнай праблеме «М.А. Максімовіч і Кіеўская гісторыка-філалагічная школа ў славістыцы: вытокі, традыцыі, персаналіі», а другі – міжнароднаму навукова-мастацкаму часопісу «COLLEGIUM» на сцэне, а 24 чэрвеня – творчай спадчыне С.Б. Бурагі ў кантэксце сучаснай гуманітарнай навукі.

Літаратуразнаўчая праблематыка разглядалася на секцыі «Мастацкая літаратура ў кантэксце культуры», на якой было прадстаўлена 189 дакладаў, 9 з якіх абмяркоўваліся на пленарным секцыйным пасяджэнні, а астатнія – на падсекцыях.

Выступленні літаратуразнаўцаў з розных краін свету (Украіны, Расіі, Беларусі, Балгарыі, Польшчы, Кітая, Паўднёвай Карэі, ЗША, Іспаніі, Італіі) засведчылі, што метадалагічны плюралізм неабходны і непазбежны пры сучасным літаратуразнаўчым аналізе мастацкіх твораў. Сёння літаратурная навука ў чарговы раз перажывае перыяд пошукаў аптымальнай метадалогіі. Навукоўцы з дзяржаў, што ўтварыліся на постсавецкай прасторы, зыходзілі часцей за ўсё з прынцыпаў сацыялагічнага, кагнітыўнага, кампаратыўнага і постструктуралісцкага літаратуразнаўства, прычым у дакладах украінскіх літаратуразнаўцаў дамінавалі сацыялагічны, кампаратывісцкі і постструктуралісцкі падыход, у расійскіх – структурна-тыпалагічны, кампаратывісцкі і кагнітыўны, у беларусаў – кампаратывісцкі і структурна-тыпалагічны, у заходнееўрапейскіх літаратуразнаўцаў – прынцыпы фенаменалагізму, рэцэптыўнай крытыкі, псіхааналітызму, постструктуралізму. Безумоўна, выбар метадалогіі – рэч па-свойму суб'ектыўная, бо кожны навукоўца аддае даніну традыцыям нацыянальнага і сусветнага літаратуразнаўства і асабістаму густу, аднак аналіз выступленняў прыводзіць да высновы, што па-ранейшаму захоўвае свае пазіцыі кампаратывізм, што постструктуралізм і новы гістарызм не змаглі стаць вядучай літаратуразнаўчай метадалогіяй нашага часу.